**27 сакавіка 2006 г. спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Лідзіі Саулаўны Мухарынскай**

Выдатны вучоны, эрудзіраваны музыкант, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Л.С. Мухарынская ўсё сваё жыццё прысвяціла высакароднай мэце: раскрыццю велічы і прыгажосці найкаштоўнейшага здабытку беларускага народа – яго музычнай фальклорнай спадчыны.

У Беларусь ураджэнка Тыфліса Л.С. Мухарынская прыехала ў 1939 г. пасля заканчэння Маскоўскай кансерваторыі і зраднілася з ёй на доўгія гады. Кола пытанняў, якія цікавілі Мухарынскую як даследчыцу музыкі, было надзвычай шырокім. Гэта і беларускі музычны фальклор – традыцыйны і сучасны, і беларуская прафесійная музыка, стылі сусветнай кампазітарскай творчасці на гістарычным абсягу ад Баха да Мяскоўскага, Пракоф’ева і Шастаковіча. Але галоўнай справай жыцця Мухарынскай стала вывучэнне, выкладанне і прапаганда беларускай народнай песні. Менавіта праз яе даследаванні народная песня Беларусі ўвайшла ў гісторыю музыкі Еўропы. Працы Л. Мухарынскай “Белорусская народная песня. Историческое развитие” (1977), “К вопросу об эстетическом освоении действительности в современном белорусском народно-песенном творчестве” (1982), “Мелодический язык современной белорусской народной песни” (1966) трывала ўвайшлі ў навуку, сталі своеасаблівым падручнікам для студэнтаў музычных вузаў. Да іх далучаюцца шматлікія іншыя навуковыя працы, навукова-папулярныя і публіцыстычныя артыкулы і нарысы, прысвечаныя народнай песні, яе выкладчыкам і народным выканаўцам. “За ўсім гэтым – вялікая праца, жывая думка і маштаб навукоўца, чыя дзейнасць у абраных ім сферах заставалася творчасцю і падзвіжніцтвам, цалкам аддадзенымі музыцы”*.

Вялікую Айчынную вайну, з восені 1941 г. па верасень 1945 г., Лідзія Мухарынская прайшла медсястрой-дабравольцам. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Менавіта ў гэты час увагу даследчыцы прыцягнула партызанская песня. Ужо пасля заканчэння вайны яна зрабіла больш за 200 запісаў гэтых песень і найгрышаў. Лепшыя з іх увайшлі ў працу Л. Мухарынскай “Белорусская народная партизанская песня, 1941–1945” (1968), якая з’явілася першым у гісторыі айчыннага музыказнаўства спецыяльным даследаваннем беларускай партызанскай песні.

Больш за 40 год жыцця аддала даследчыца выкладчыцкай дзейнасці. У розны час яна вяла ў Беларускай кансерваторыі курсы беларускай і рускай народнай творчасці, гісторыі замежнай, рускай, савецкай музыкі і інш. Усе беларускія кампазітары і музыказнаўцы, якія вучыліся ў гэтай навучальнай установе з 1939 па 1981 гг., былі яе вучнямі. Ім перадавала Л. Мухарынская любоў да беларускага фальклору, захапіла сваім стаўленнем да Баха і Шастаковіча – самых блізкіх ёй кампазітараў ва ўсім неабсяжным свеце музыкі. Л.С. Мухарынская імкнулася абудзіць у сваіх вучнях прагу пазнання, выхаваць мастацкі густ і інтэлігентнасць. У яе памяць Беларуская акадэмія музыкі ўжо некалькі гадоў запар арганізуе навукова-тэарэтычныя чытанні, прымеркаваныя да дня нараджэння Л.С. Мухарынскай, якія адпавядаюць яе даследчыцкім памкненням, напрамку яе навуковых роздумаў, колу творчых ідэй.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2006 г.

* Якіменка, М. Сучасная беларуская этнамузыкалогія / Тамара Якіменка. Мінск, 2004. С. 220.